# Прэзентацыя зборніка вершаў “Узлёт”

**Мэта:**

пазнаёміць гурткоўцаў з задачамі праекта на другое паўгоддзе,

даць характарыстыку зборніку вершаў “Узлёт”,

пазнаёміць з яго зместам (вершы, напісаныя вучнямі 5-8 класаў на розныя тэмы),

праслухаць выбраныя вершы для зборніка;

праслухаць вершы вучняў і настаўнікаў, прызначаныя для наступнага нумара газеты “Крыніца”і на сайт школы;

развіваць творчыя здольнасці вучняў,

выхоўваць эстэтычны густ.

1..Слова кіраўніка гуртка “Крыніца”.

Ужо больш за 11 гадоў працуе наш гурток “Крыніца”. Ці задумваліся вы калі-небудзь, што значыць гэта слова. Што такое крыніца?

Гэта чыстая вада, якая б’е з глыбінь зямлі. Яна сапраўды чыстая, гаючая ( ад слова гаіць, загойваць), халодная, якой можна прагнаць смагу. Значыць, без яе няма здаровага жыцця.

Некалі, даўшы такую назву гуртку, я нават і не спадзявалася, што крыніца творчасці вучняў і настаўнікаў Крываносаўскай школы будзе бясконцай. А яна сапраўды б’е і б’е, выносячы на свет цэлы ўсё новыя і новыя імёны. Часопіс наш ужо ператварыўся у зборнік вершаў, і не адзін!



Сёння ў нас зусім незвычайнае пасяджэнне гуртка. Мы ўсе разам павінны праслухаць нямала вершаў і вызначыць, ці вартыя яны ўпрыгожыць зборнік вершаў пад назвай “Узлёт”. Якія гэта вершы? Гэта творчасць самых юных паэтаў нашай школы розных гадоў—вучняў 5-8 класаў.

Для 9-11 класаў будзе другі зборнік з назвай “На парозе”.

Сёння не адно пакаленне выйшла ў дарослы свет з нашага гуртка, а вершы-то засталіся. Гэта першы наш зборнік. Я думаю, што ён зойме годнае месца разам з “Летапісам Крываносаўскай школы”.



Я прасіла вас падрыхтаваць узоры тытульнага ліста зборніка, вокладкі.




Мы будзем выбіраць самую цікавую вокладку з прапанаваных вамі. Усе іншыя таксама ўвойдуць у зборнік. Ён будзе фарміравацца да канца навучальнага года. Так што ёсць магчымасць яго папаўняць.

У зборніку будуць указаны імёны і прозвішчы і гады выпуску, а таксама змешчаны вашы фотаздымкі.



Паўтараю, гэта мы робім упершыню. Сёння ўсе вы выступаеце ў ролі аўтараў, крытыкаў, кансультантаў. Ад нас залежыць, які атрымаецца зборнік, ён стане добрым пачаткам, увойдзе ў гісторыю школы. А вы, стаўшы дарослымі, будзеце ведаць, што ў гэтым зборніку і ваша творчасць.



Ітак пачнём нашу працу. Пачнём з самых дарослых нашых паэтаў, з 11-класнікаў. Для іх гэты год апошні. Але як ні дзіўна, яны таксама былі малымі.

**Санкевіч Надзея** пачне першая, бо ў яе верш толькі адзін, але я яго захавала.

Сонца няма,
Зіма надышла.
Гуляюць дзеці.
Дарослыя чытаюць навіны ў газеце,
Трэба птушкам дапамагаць,
Каб ім зіму лягчэй зімаваць.
Нельга на месцы стаяць:
Мароз пачынае за шчокі шчыпаць.

Вельмі веру, што да канца года Надзя напіша яшчэ, але ўжо ў зборнік “На парозе”.

**Ракавец Дзмітрый** піша шчыра і разумна. Цяпер яго вершы яшчэ і мудрыя.

Матуля, матуля, прыгожая мая!
Найлепшая, найлепшая, чакаю цябе я.
Усмешкаю, усмешкаю развесяліш мяне.
Словамі, словамі распесціш ты мяне.
А едзеш ты з работы, стомленая мая,
А я цябе пешчу, прыгожая мая…

Чакаем ад цябе вершаў-роздумаў яшчэ.

**Калач Дзіяна** напісала не адзін раз. Але верш пра маці вельмі шчыры

Ад няшчасця ратуе,
Добра ведаю я,
Дарагая матуля,
Любая мама мая.
Праз гады і растанні
Помню песні твае,

Помню цёплыя ранні
І валасы ў сівізне…
Толькі зычаць удачу
І дабра даюць мне,
І прылашчаць, як плачу,
Мілыя рукі твае.

Дарагія выпускнікі, мы чакаем ад вас больш вершаў. Жадаем вам творчага натхнення і стараннай вучобы, якая дасць магчымасць вызначыцца ў будучым.

**Сойка Крысціна** напісала некалькі вершаў і замоўкла надоўга. Думаю, што сёння мы яе падштурхнём для працы. Прыйдзе творчае натхненне.

Зімой успамінаю прыгожыя дзянькі,
Дзе па лістоце я гуляла ля ракі.
Неба зацягнулася хмарамі вялікімі
Дождж лінуў струменямі шматлікімі.

Зімой успамінаю прыгожыя дзянькі,
Дзе лісце залацілася,
Дзе рэчка серабрылася.
Прыгожая пушынка
На далонь спусцілася
Вочка-серабрынка
Зорачкай заіскрылася.

**Ракавец Роза** заўсёды выдзяляецца сталасцю і мудрасцю, таму і вершы яе такія. Іх многа.

Зімні ўспамін пра восень
Снег на вуліцы бялее,
Заяц футра памяняў.
Птушкі ўсе ўжо адляцелі,
І на дварэ стаіць зіма.
Снег ідзе, ідзе, ідзе,
І ідзе бясконца.
А мяцель усё кліча, кліча,
І няма ўжо сонца.
Дзень пахмурны і халодны,
Снег глыбокі, рыхлы.
Ночы сталі даўжэй крыху,
Вецер моцны і марозны.

А, здаецца, лісцікі ўчора
Кружыліся, як залатое мора.
Павольна падалі, як з нябёс—

Вось такі ў іх незвычайны лёс.

## Красивая природа

У нас красивая природа
Везде и для всего народа.
Люби её—и тебя ждёт удача.
Ведь это несложная задача.

Природа будет жить всегда.
А это деревья, цветы и вода.
Это луга и леса, сотни рек--
Обязан  природу беречь человек.



Як хораша, калі пра маму піша сыны. Ды яшчэ такія, як Ракавец Дзмітрый і **Бабіч Сяргей.** Таксама ўжо даўно не пісаў.

Матуля мая дарагая,
Люблю я вельмі цябе,
Люблю і не забываю,
Як рукі твае саграваюць мяне.

Матуліны рукі—шчырая ласка
І голас, што спявае калыханку.
А потым расказвае казку
Пра светлую лясную палянку.
Цеплыня твая незвычайная.
Матуля не кіне аднаго мяне:
Сардэчнасць твая бяскрайняя
Нікога дабром не міне.

Паспрабаваў салодкі хлеб паэзіі і **Манько Дзяніс** і заціх.

Поры года
Прачынаецца прырода
Пасля доўгага сну
І на крыллях нам прыносяць
Птушачкі вясну.
Ярка свеціць сонейка,
Саграваe кветку.
Ну калі гэта бывае?
Ну вядома ж улетку.

У вырай ляцяць птушкі,
Мокрая дарога.
Гэта восень зашуршала
Лісцем ля парога.
У паветры закружылі
Белыя сняжынкі.
Гэта зімка замятае
Нашыя сцяжынкі.

**Вольга Дземідовіч** піша вельмі шчыра і душэўна.

За акном мятуць снягі,
Сталі белыя лугі.
Снегіры на дрэвах прыг-скок.
Снег нападаў і ў агарод.

Белы лес здалёк стаіць.
На дарогах гурбы снегу.
Пад лёдам рэчка не бяжыць,
А сняжынкі ў імклівым бегу.

Дзесяцікласнікам творчасці жадаю, бо на наступны год вы выпускнікі! Дзевяцікласнікі пішуць рэдка, але значна.

**Клімава Анастасія**

Падаюць сняжынкі--
Надышла зіма.
Восень залатая ўчора адышла.
Падаюць сняжынкі--
Надышла зіма.
Я гляджу ў акенца--
Вось яна, краса.
Светлае адзенне,
Белая каса,
Белы снег пушысты
З сабой прынясла.
Падаюць сняжынкі--
Надышла зіма.
Беленькую коўдру,
Белую хусцінку
З плячэй сваіх зняла.

**Арцімовіч Анастасія**



Кніга вучыць чалавека жыць,
Кніга вучыць нас любіць.
Кніга сябар наш заўжды—
Усе мы сёстры і браты.

Кнігу трэба шанаваць,
Каб усё заўсёды знаць.
Трэба з сябрам адпачыць,
Разам кніжку нам раскрыць.

Прыйшоў Васечка дамоў,
Адгарнуў ён кніжку--
Там убачыў ён звяроў
Ды  рыжую лісічку.
Адгарнуў яшчэ старонку--
Там ваўка ён  бачыць.
А ў лесе праз палянку
Мішка ціха  крочыць.
Зубрыха корміць зубраня,
Ловіць мушак жабка,
А ў норцы зайчаня
Чакае сваю матку.
Гэта кніга ўсё пакажа,
Намалюе і раскажа.
Трэба з кнігай сябраваць,
Каб усё на свеце знаць.

**Арцімовіч Паліна** працягнула традыцыі Дубатоўкі Аляксандра і Дамарада Паўла. У яе атрымаўся цудоўны трыялет

Трыялет

Хай свеціць сонейка ярчэй,
Хай ветрык цёплы павявае
І ярка ў небе зорачка заззяе,
Хай свеціць сонейка ярчэй.
Хай воблакі плывуць над гаем,
Матуля песні напявае,
Хай свеціць сонейка ярчэй,
Хай ветрык цёплы павявае.



**Шчарбінская Вікторыя** ў нас філосаф. Напісала адзін раз—і філасофія ў паэзіі закончылася. Пачалася філасофія жыцця.

Прыгожа ўсё здаецца--
Цудоўных мар пасыл.
Так першы снег кладзецца
На ўсёй нашай зямлі.
Дні хутка пралятаюць—
І снегу зноў няма.
На сэрцы залягаюць
Смутак, скруха і хандра.
Паветра дзьме ў вуха,
І я іду дамой,
І там праходзіць скруха--
Я зноў знайду спакой.

**Старавойтава Вікторыя** любіць прыроду, любіць разважаць

Снег

Упаў белы, белы снег
На зямлю маю чыстую,
На рэкі іскрыстыя.
Усё пабялела, пасвятлела,
На душы сонейка запела.
А вясна ўжо ўсміхаецца,
Снег у ручайкі ператвараецца.

**Емяльянава Анжаліка** піша многа і лёгка. Пажадаем ёй удачы.

Снег, як серабро, іскрыцца,
У мяцеліцы кружыцца,
Як чысты беленькі пушок.
Ты ляці, ляці, сняжок,
І, як цёплы кажушок,
Пакрывай зямлю, дружок.
Шмат сняжынак у крузе,
Засцілае ўсё на лузе.



Вечар зімні і марозны …
Палягло ўсё жывое спаць.
А за акном цямнеюць сосны,
Ды зоркі ў небе зіхацяць.
І звонкі месячык міргае,

Праменні соснам шле.
Быццам нешта ён тут знае,
Раскажа мне ў дзіўным сне.

**Еўдакімава Аліна**—стараста гуртка. Яна дастойна замяніла Дамарада Паўла. Дзяўчынка вельмі адказная, мэтанакіраваная, ужо цяпер ведае, чаго хоча. Такія яе і вершы.

Школа



Школа наша дарагая,
Ты як маці нам другая.
Колькі ведаў нам дала
І з сябрамі нас звяла!
Цябе любіць заўсёды будзем
І ніколі не забудзем.

Калі паедзем куды-небудзь мы,
Нам хутка ўспомняцца тыя двары,
Дзе раслі мы, вучыліся, разам гулялі
І вялікай бяды ніколі не зналі.
Успомнім і луг, і бязмежнае поле,
Дзе любілі мы бегаць на волі.
Успомнім матуліны цёплыя рукі,
Пры ёй вымаўлялі мы першыя гукі.

**Ціхамірава Ганна** піша коратка, па-беларуску пішацца цяжка. Спадзяюся, што творчае натхненне яе не пакіне.

Крыніца
У “Крыніцы “ я ўдзельнічаю,
Вершы туды свае пішу,
Бо люблю сэрцам паэзію,
У душы любоў нашу.

Кніга вучыць нас любіць,
Вучыць правільна лічыць.
Кніга вучыць вандраваць
І аб часе забываць.
Яна сябар назаўжды,
Не забудзь яе і ты.

На небе бачым колер розны:
То шэры, нават чорны, грозны,
То белы, як малако разліта,
То сіні, вытканы з блакіту.
А вясёлка яркая ўзышла
Пасля дажджу і сонейка ўпляла.
Аранжавы, сіні і зялёны,
Фіялетавы, і жоўты, і чырвоны…

**Захаркова Вікторыя** піша на розныя тэмы, добра адчувае рыфму верша.

Зіма, зімушка мая,

Зачаравала ты мяне
І бялюткім снегам,
І калючым ветрам,
Што за шчокі шчыпле
І сняжком пасыпле
Ды  на поле і на луг—
Усіх адзене ў кажух,
Цёплы, пушысты,
Бялюткі, іскрысты.

**Ціхамiраў Расціслаў** з роднай мовай не вельмі сябруе, аднак з маёй дапамогай нешта атрымліваецца.

Зямля Беларусі, зялёныя долы,
Якая ж прыгажосць вакол!
Няма табе роўнай,
Бо ты непаўторна,
Як маці, адзiная
І намі любімая,
Як бацька, ты моцная,
Як дзед і бабуля, ласкавая.
***
Мая Радзіма—зялёная краса,
Тут рэкі, і азёры, і чыстая раса.
Ты лепшая самая
На ўсёй нашай зямлі
Прырода наша слаўная—
Цябе мы зберaглі.

**Ляцяга Яна** не столькі ведае мову, але прыгажосць адчувае.

Першае слова мама гучыць узнёсла.
А нас гадаваць ёй так няпроста.
Мамаў сваіх усе мы любім,
А станем дарослымі— іх не забудзем.
-
Якая ты цудоўная,
Залатая і чароўная!
Лісток ляціць у паветры
Ў нязведаныя нетры.
Сонца пaглядае,
Ветрык лісце паганяе.
Вожык грыб нясе,
Ліса курэй трасе.
Усё жывое наглядае—
Ды прырода ў нас такая.

ВОСЬ ГЭТЫЯ І МНОГІЯ ІНШЫЯ ВЕРШЫ БУДУЦЬ У ЗБОРНІКУ ВЕРШАЎ “УЗЛЁТ”.Ці згодны вы з гэтым?  Падтрымаем апладысментамі.

У наступным нумары літаратурнай газеты і адпаведна на сайце нашай школы будуць змешчаны вершы філасофскага кірунку. Гэта будуць паэтычныя разважанні вучняў і настаўнікаў нашай школы аб усім, што нас хвалюе. Некаторыя з іх прагучаць тут упершыню.
Таму цяпер надышоў важны і хвалюючы момант, нечаканы і вельмі прыемны. Упершыню на нашым пасяджэнні **Прахоцкая Таццяна**. Яна рашылася паказаць мне свой верш. Таня чытае ўпершыню для нашай «Крыніцы». Падтрымаем яе. Калі ласка, Таццяна.

Прахоцкая Таццяна

Наигранный смех,
Пронзительный смех--
Высшая степень удачи,
Вы спрятались весьма удачно.

Маскарадный бал
Как обыденный день…
Маски, маски, смех…
Под смехом спрятано несчастье,
Слеза, бегущая рекой,
Упущенное счастье,
Пришедшее несчастье…
Решение просто--
Всего лишь маска, маска, смех…
Вам не надоест
Скрываться в гуще маски?

Вельмі яшчэ чакае “Крыніца” ад цябе вершаў. Зараз нас чакае яшчэ большя нечаканасць.



**Пархімовіч Наталля Валянцінаўна**, настаўнік біялогіі і хіміі раптам стала лірыкам.Яна ўпершыню на нашым пасяджэнні і хвалюецца, як вучаніца. Падтрымаем яе.

**Зіма – чараўніца**

Зіма – чараўніца, што ж ты нарабіла?
Ледзяным дажджом зямлю ты ўкрыла.

Усё пакрыта інеем, усё пакрыта льдом,
Быццам бы прырода вымерла кругом.

Зіма –чараўніца, што ж ты нарабіла?
Ты бярозкі нізка да зямлі схіліла.

І стаяць усе дрэвы ў белі ледзяной,
Просяць яны сонца, каб ажыць вясной.

Зіма – чараўніца, нарабіла ты бяды--
Нашы вёскі ў раёне без святла і вады.

Зіма- чараўніца, больш ты не хітры—
Беражы прыроду на роднай зямлі.



**Манько Святлана Сяргееўна** піша вершы даўно.Наша газета змяшчала іх не раз, былі яны і ў раённай газеце. Яна не хацела сёння да нас завітаць. Але яе верш зусім незвычайны. Толькі яна павінна яго прачытаць. Ён завяршыць наша пасяджэнне і прымусіць задумацца над сваім жыццём.

Зима—такое время года,
Что мёртвой кажется природа.
Снег покрывает всё кругом,
Природа спит глубоким сном.

Но вдруг Зиме казаться стало:
Из снега тонко покрывало!
И в ледяное одеяло
Она природу заковала.
Согнулись юные берёзки,
Как тяжело им, льются слёзки
На белый снег, а буйный ветер
Их утирает, словно детям.
Берёзы старые сломались,
Хотя сперва они пытались
Стряхнуть тяжкое одеяло.
Но сил у них уж было мало.

Зачем всё это нужно было?
Зима природу загубила.
Кусты, деревья подо льдом
Теперь уснули вечным сном.

Жыццё нам даецца толькі адзін раз, як божы падарунак, і ім трэба даражыць. Будзьце ўсе здаровы і каб у прыродзе і ў жыцці было як мага мернш нечаканасцей. Да новых сустрэч!